песенных твораў: акрамя выканання вакатыўнай функцыі, яны павінны выклікаць эмоцыі і пачуцці – жаласць, тугу, радасць, любоў, ласку, замілаванне і пад. Зваротак у памяншальна-ласкальнай форме не толькі здольны характарызаваць адносіны да адрасата, але і выконвае некаторыя магічныя функцыі: задобрыць, паспагадаць, суцешыць, выказаць прыхільныя адносіны, выклікаць давер і атрымаць у выніку адпаведную рэакцыю субяседніка (апелятыўная функцыя). Акрамя таго, зваротак уплывае і на кампазіцыю твора, стварае непаўторныя матывы з пункту гледжання нацыянальных асаблівасцей.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Анталогія беларускай народнай песні і прыпеўкі / уклад. і прадм. А. Цітаўца. – Мінск: Ураджай, 2001. – 352 с.

2. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс [і інш.]; пад навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 515 с.

3. **Формановская, Н. И.** Обиходные обращения и поэтическая обращенность / Н. И. Формановская // Русский язык за рубежом. – 2009. – № 1. – С. 61–64.

4. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік [і інш.]; пад навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 422 с.

УДК 8(07): 371(07)

***В. І. Караткевіч***

## КРАЯЗНАЎЧАЯ ЛІТАРАТУРА Ў АСПЕКЦЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАВАНАСЦІ: РАЗВІЦЦЁ НАВЫКАЎ АСЭНСАВАНАГА ЧЫТАННЯ

**Анатацыя.** Чытацкая адукаванасць мае на мэце развіццё здольнасці вучняў разумець і выкарыстоўваць пісьмовы тэкст для пашырэння ведаў і ўдзелу ў сацыяльным жыцці. Пры *асэнсаваным чытанні* разуменне тэксту суправаджаецца разуменнем павярхоўнага інфармацыйнага ўзроўню зместу, асэнсавання адносін паміж суб'ектамі гісторыі і ўласнага стаўлення да твора або падзеі. Выкарыстанне краязнаўчых тэкстаў у адукацыйным працэсе спрыяе развіццю навыкаў асэнсаванага чытання.

**Ключавыя словы**: функцыянальная адукаванасць, асэнсаванае чытанне, краязнаўчы тэкст.

Прыярытэтнай мэтай адукацыі ў сучаснай школе з'яўляецца развіццё асобы, гатовай да ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем, да самаадукацыі і самаразвіцця. Адпаведна патрабаванням да зместу і плануемых вынікаў засваення вучнямі асноўных адукацыйных праграм найбольш важным лічыцца фарміраванне ў навучэнцаў універсальных, метапрадметных вучэбных дзеянняў, асаблівае месца сярод якіх займае чытанне і работа з інфармацыяй. Паспяховае навучанне ў школе немагчыма без сфарміраванасці ў навучэнцаў ***чытацкай адукаванасці***.

Чытацкая адукаванасць перш за ўсё мае на мэце развіццё здольнасці вучня разумець і выкарыстоўваць пісьмовы тэкст, разважаць пра яго і чытаць для дасягнення уласных мэт, пашырэння ведаў і ўдзелу ў сацыяльным жыцці. Такія віды чытання, як *функцыянальнае* (паводле мэты атрымання інфармацыі) і *творчае* (паводле ступені асэнсавання) ў цяперашні час найбольш запатрабаваны для фарміравання чытацкіх кампетэнцый.

Адзначым, што, па выніках міжнароднага даследавання PISA-2018, «найбольш высокія вынікі беларускія навучэнцы дэманстравалі ў заданнях, якія прадугледжвалі знаходжанне інфармацыі (справіліся 64,65 %), а найбольшую складанасць у іх выклікалі заданні, якія патрабуюць прымянення навыкаў ацэнкі і асэнсавання тэкстаў (справіліся 53,04 %). Да ліку цяжкіх для беларускіх навучэнцаў (справіліся менш за палову тэстуемых) адносяцца заданні, скіраваныя на вымярэнне кагнітыўных уменняў інтэгрыраваць і інтэрпрэціраваць інфармацыю (разуменне сэнсу), а таксама навыкаў крытычнай ацэнкі і аналітычнага асэнсавання тэкстаў» [6, с. 26]. Прыведзеныя даныя ў большасці супадаюць з нацыянальнымі маніторынгавымі даследаваннямі якасці адукацыі, у тым ліку па чытацкай адукаванасці на розных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

Разуменне інфармацыйнага, сэнсавага і ідэйнага бакоў твора ў іх узаемасувязі дазволіць сфарміраваць у навучэнцаў навык ***асэнсаванага чытання*** [2], пры якім разуменне тэксту суправаджаецца разуменнем не толькі павярхоўнага інфармацыйнага ўзроўню ўспрымання зместу, але і асэнсавання паслядоўнасці фактаў, адносін паміж суб'ектамі гісторыі, прычынна-выніковых сувязей паміж падзеямі і выбудоўвання свайго стаўлення да твора або падзеі. Важна разумець, што чытанне як працэс не з'яўляецца самакаштоўнасцю. Яно павінна быць асэнсаваным, калі «дасягаецца разуменне інфармацыйнага, сэнсавага і ідэйнага бакоў мастацкага твора. Мэта асэнсаванага чытання – максімальна дакладна спасцігнуць каштоўнасна-сэнсавыя аспекты тэксту, г. зн. ажыццявіць яго інтэрпрэтацыю» [1, с. 29]. Перманентнае спасціжэнне мастацкіх твораў поўнасцю перабудоўвае работу галаўнога мозгу. Псіхолагі адзначаюць, што праз глыбокае асэнсаванае чытанне («deep reading») на працягу доўгага часу дасягаецца канцэнтрацыя ўвагі на пэўнай праблеме, чалавек здольны больш паспяхова засвойваць складаную інфармацыю. Чытанне на такім узроўні павінна падтрымлівацца пастаянна, у адваротным выпадку назіраецца страта гэтых навыкаў [7].

Пры асэнсаваным чытанні работа з тэкстам можа весціся па наступных напрамках:

– пошук інфармацыі і разуменне прачытанага, супастаўленне розных крыніц інфармацыі і розных пунктаў гледжання, фарміраванне ўласнай пазіцыі;

– работа з тэкстамі, якія змяшчаюць малюнкі, табліцы, дыяграмы, схемы;

– інтэрпрэтацыя інфармацыі на аснове супастаўлення ілюстратыўнага матэрыялу з інфармацыяй тэксту.

Такую тэкставую работу можна праводзіць і падчас знаёмства з ***краіназнаўчымі*** публікацыямі.

Сучасная сацыякультурная сітуацыя ў грамадстве і сферы адукацыі, працэсы гуманізацыі, мадэрнізацыі амаль на ўсіх узроўнях адукацыі (ад агульнай сярэдняй да вышэйшай), спробы стварыць умовы для фарміравання ў вучняў і студэнтаў каштоўнасных адносін да дасягненняў культуры, патрэбы ў інтэлектуальнай і духоўнай дзейнасці, у самаадукацыі надзвычай актуалізуюць праблему выкарыстання краіна- і краязнаўства ў адукацыйным працэсе. Пры гэтым, напрыклад, у беларускай мове назіраюцца «моцныя інтэрнацыяналізацыйныя працэсы, абумоўленыя глабалізацыйнымі тэндэнцыямі, а таксама жаданнем увайсці ў еўрапейскую моўную супольнасць, мець агульны тэрміналагічны фонд і ўвогуле большай «прэстыжнасцю» ўжывання некаторых лексічных адзінак у побытавым і прафесійным маўленні (трэнд замест напрамак, мэседж замест пасланне, паведамленне і інш.)» [3, с. 5]. Тым не менш «руская мова, як беларуская і іншыя мовы, якія функцыянуюць на тэрыторыі Беларусі, адчуваюць канкурэнтны ціск <…>. Сучасныя маладыя людзі ўсё часцей матываваны на вывучэнне англійскай мовы, якая выкарыстоўваецца ў якасці «lingua franca» [4, с. 6].

Сучасны разрыў адукацыі і культуры патрабуе пераходу ад прыёмаў засваення сукупнасці прадметных ведаў да працэсу спасціжэння агульнай карціны свету. Таму краязнаўства, якое нясе ў сабе інтэграцыйны стрыжань, дапамагае фарміраванню ў свядомасці вучняў цэласнай карціны рэчаіснасці.

Краязнаўства дапамагае вырашыць мноства дыдактычных задач:

– спрыяе абуджэнню цікавасці вучняў да жыцця насельнікаў свайго краю, пашырэнню кругагляду, паглыбленню і пашырэнню ведаў і эстэтычнага густу навучэнцаў, рашэнню выхаваўчых задач;

– дапамагае найбольш поўна ўявіць пэўную гістарычную эпоху, зразумець матывы паводзін некаторых гістарычных асоб або літаратурных персанажаў, сацыяльных пластоў і творчага асяроддзя пэўнай эпохі;

– дае магчымасць глыбей пазнаёміцца з гісторыяй грамадскага жыцця, культуры роднага краю, суаднесці яе з культурай дзяржавы;

– дазваляе ўбачыць спецыфіку не толькі гістарычнага часу, але і геаграфічнай і культурнай прасторы, «упісвае» іх у сусветны гісторыка-культурны працэс.

Узорам прымянення ў вучэбным працэсе краязнаўчага тэксту можа быць выданне І. Куркова і І. Пушкіна «*Могилевщина*: *легенды*, *события*, *люди*» [5]. Па словах аўтараў, кніга з’яўляецца зборам нарысаў па гісторыі Магілёўшчыны, напісаных на аснове архіўных дакументаў, музейных калекцый і літаратурных крыніц, якія апавядаюць пра невядомыя падзеі мінулага і знакамітых асоб або людзей, мала вядомых, але тым не менш яркіх і таленавітых [5, с. 2].

Ужо з першых старонак праяўляецца магчымая міждысцыплінарнасць гэтага выдання: аўтары тлумачаць выбар Магілёўшчыны ў якасці прадмета даследавання з прычыны знаходжання найстаражытнейшых на Беларусі стаянак першабытных людзей менавіта на тэрыторыі Беларускага Падняпроўя. Аўтары лічаць, што на гэтых землях «сходились великие магистрали, на которых решались судьбы стран, народов, цивилизаций. К примеру, тысячу лет назад пересекались древнейший путь «из варяг в греки» и почти незаметная тогда дорога – будущая «ось мира» Восток – Запад» [5, с. 6].

Думаецца, гэтыя і падобныя звесткі можна паспяхова выкарыстоўваць на занятках па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі і грамадазнаўства, на якіх прасочваюцца фарміраванне старажытных і сучасных гандлёвых саюзаў і шляхоў.

На факультатыўных занятках па астраноміі можна выкарыстаць факты з летапісаў і хронік Магілёўшчыны. Так, пра значную працягласць руска-турэцкай вайны 1768–1774 гг. сведчыла камета ў небе над Магілёвам у 1769 г. у выглядзе зоркі з доўгім хвастом, якая на працягу паловы месяца ўзыходзіла на неба і была бачная да самай раніцы. А перад нашэсцем Напалеона на небе таксама з'явілася вялікая камета, якую жыхары Магілёва назіралі да снежня 1811 г. [5, с. 53]. Такія звычайныя для даўнейшага чалавека апісанні «хвастатых зорак» – камет – для сучасных вучняў могуць з'явіцца не толькі кур'ёзным фактам «адсталага» мыслення нашых продкаў, а нагодай пацікавіцца і сярэднявечнай літаратурай, і вывучэннем астранамічных аб'ектаў.

Раздзел кнігі «Могилёвщина – родина потомков А. С. Пушкина, а ещё его … предков» прысвечаны, відавочна, даследаванню генеалагічнага дрэва славутага рускага паэта і магчымага паходжання яго продкаў з беларускіх тэрыторый [5, с. 122–126]. Думаецца, междысцыплінарнасць і чытацкая асэнсаванасць пры ўспрыманні прапанаваных фактаў дапаможа вучням прасачыць узаемасувязь паміж асаблівасцямі літаратурнага працэсу ў Расійскай Імперыі, у Савецкім Саюзе і ў Рэспубліцы Беларусь з улікам і аналізам усіх гісторыка-сацыяльных характарыстык названых перыядаў існавання нашай дзяржавы.

Гэта толькі некаторыя прыклады прымянення краязнаўчых тэкстаў для фарміравання функцыянальнай чытацкай адукаванасці. Вынікам развіцця асэнсаванага чытання стане сфарміраванасць інтэрпрэтацыйных уменняў у вучняў падчас супастаўлення імі краязнаўчай літаратуры з творамі мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, навуковымі і навукова-папулярнымі выданнямі. Да таго ж навык асэнсаванага чытання паспрыяе ўзбагачэнню асобасна-творчага вопыту вучня ў працэсе пабудовы цэласнай карціны гісторыка-культурнага працэсу ў межах рэгіёна, дзяржавы, кантынента.

У аспекце функцыянальнай адукаванасці краязнаўства можа стаць фактарам, які спрыяе пераадоленню прадметнай дыферэнцыяцыі навучання,

пабудове міжпрадметных сувязей на дзейнасным узроўні, разуменню і асэнсаванаму ўспрыняццю фактаў культуры і гісторыі.

Такім чынам, сацыяльныя патрэбы ва ўзаемасувязі з новымі тэндэнцыямі ў адукацыі падкрэсліваюць актуальнасць фарміравання ў навучэнцаў навыкаў асэнсаванага чытання ў аспекце функцыянальнай адукаванасці і неабходнасць распрацоўкі педагагічных методык з выкарыстаннем краязнаўча-этнаграфічных, архіўных, музейных, экскурсійных матэрыялаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Караткевіч, В. І.** Да беларускай мовы – праз асэнсаванае чытанне. Развіццё чытацкіх кампетэнцый у школьнікаў і студэнтаў / В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч // Народная асвета. – 2021. – № 2. – С. 28–31.

2. **Караткевіч, В. І.** Як заахвоціць школьнікаў да чытання кніг на роднай мове / В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч // Народная асвета. – 2022. – № 2. – С. 30–33.

3. Беларуская лексіка і граматыка: моўная стыхія і моўная норма : дапаможнік / І. І. Караткевіч [і інш.]. – Кіеў: Ліра-К, 2018. – 140 с.

4. **Короткевич, В. И.** Русский язык в системе образования Республики Беларусь / В. И. Короткевич, Е. В. Шарапова // Русский язык в глобальном научном и образовательном пространстве: материалы Междунар. науч. конгресса, Москва, 6–10 дек. 2021 г. – Москва: Гос. ин-т русского языка им. А. С. Пушкина, 2021. – С. 4–7.

5. **Курков, И.** Могилевщина: легенды, события, люди / И. Курков, И. Пушкин. – Минск: Медиафакт, 2004. – 304 с.

6. **Позняк, А. В.** PISA-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А. В. Позняк ; под науч. ред. Г. С. Ковалевой. – Минск: Медисонт, 2021. – 68 с.

7. **Henrich, J.** The weirdest people in the world? / J. Henrich, S. Heine, A. Norenzayan // Behavioral and Brain Sciences. 2010. – Vol. 33 (2–3). – P. 61–83.

УДК 811.161.3'373:78

***Д. А. Карпечкіна, В. І. Сідарэнка***

## МЕТАФАРЫЗАЦЫЯ ЯК ПРАДУКТЫЎНЫ СПОСАБ ПАПАЎНЕННЯ ТЭРМІНАЛАГІЧНАГА СЛОЎНІКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ МУЗЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ)

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуюцца намінацыі беларускамоўнай музычнай тэрміналогіі, утвораныя на аснове адной з асноўных разнавіднасцей семантычнай дэрывацыі – метафаразацыі. Выяўляюцца прадуктыўныя тэрмінаўтваральныя мадэлі музычных тэрмінаў, утвораных шляхам метафарычнай трансфармацыі.
**Ключавыя словы**: метафарызацыя, уласна метафарызацыя, спецыялізацыя значэння, тэрмінаўтваральная мадэль.

Імклівае развіццё навукі, выкарыстанне сучасных тэхналогій стымулюе з'яўленне мноства новых паняццяў, для называння якіх патрабуюцца ўсё новыя